БІБЛІЯТЭКА САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ

БИБЛИОТЕКА СОЮЗА ПИСАТЕЛЕЙ БЕЛАРУСИ

**ВІКТАР ШНІП**

# ПЕРШЫ ПАПЯРОВЫ СНЕГ

ВЫБРАНАЕ
(1978–2008)

МІНСК
ВЫДАВЕЦТВА «ЧАТЫРЫ ЧВЭРЦІ»
2014

УДК 821.161.1(476)-1
ББК 84(4Беи)-5
Ш77

**Шніп, В. А.**
Ш77 Першы папяровы снег : выбранае (1978–2008) / Віктар Шніп. — Мінск : выдавецтва «Чатыры чвэрці», 2014. — 266 с. — (Бібліятэка Саюза пісьменнікаў Беларусі).

ISBN 978-985-7103-01-0.

У кнігу выбраных твораў Віктара Шніпа “Першы папяровы снег” увайшлі яго лепшыя вершы і проза, напісаныя на працягу 30 гадоў

**УДК 821.161.1(476)-1**
**ББК 84(4Беи)-5**

**ISBN 978-985-7103-01-0**

© Шніп В. А., 2014
© Афармленне. ТДА «Выдавецтва “Чатыры чвэрці”», 2014

# ГРОНКА СВЯТЛА (1983)

* * *

Першага снегу святло,
Ты для мяне, як свята.
Сонца памалу ўзыйшло
З коміна крайняй хаты.

Вецер сцяжыну маю
Ноччу замёў на лузе.
Ціха на ганку стаю,
Снег патушыць баюся.

*7.12.1982*

* * *

Пакрыўдзяць, а я не заплачу.
І толькі губу прыкушу.
Не я па сцяжыне праходжу,
Сцяжына цячэ праз душу.

Агонь раскладуць каля дрэва,
Мне рукі апаліць касцёр.
Нібыта хлапчук, я заплачу,
Захоплены гутаркай зор.

Я дома, я не заблуджуся,
Хай часам сцяжыну згублю.
Я птушку суцешу малую,
Я кіну зярнятка ў зямлю.

*29.09.1982*

## МІРСКІ ЗАМАК

Мірскі замак, як балада.
Не вятры пяюць,
А стрэлы —
Час вядзе сваю асаду.
Вось і брама зарыпела.

Пераможцамі турысты
Перапоўнілі сцяжыны.
Чую голас ганарысты:
«Я адбіў сабе цагліну».

— Мо і нам узяць, паслухай?
Ды сяброўка пабялела...
Ёй здалося:
праляцела
Прашчура страла ля вуха.

*21.09.1981*

* * *

Холад ля хаты пасе снегіроў.
Сонца замецена снегам у полі.
Бацька дадому сцяжыну прывёў,
Следу не бачна ва ўсім наваколлі.
Аб даланю ён цярэ даланю,
Тупае весела, курыць цыгарку.
Маці гаворыць: «Ідзі да агню».
Бацька смяецца: «А лепей бы чарку».
Мурзік на печы ля нас не ўсядзеў,
Скочыў да бацькі за стол, на калені.
Воўну і песню матуля прадзе,
Не заўважае слязы ў задуменні.
Гэты малюнак прыпомніўся зноў.
Аркуш паперы ў мяне прад вачамі.
Полем, дзе сонца пад беллю снягоў,
Песня матулі плыве за плячамі.

*22.09.1982*

## ПЛАЧА МАЦІ

Цыбулю мама у вянкі пляце,
Нібыта дочкам заплятае косы.
Ёй чуецца ў задумнай немаце
Гадоў забытых гоман шматгалосы.

*1979*

## ЛЯСНОЙ ДАРОГАЙ

Ад снегу светла ў шэрым сасняку.
Сарока увязалася за мной.
Сцяжыны,
як рачулкі у раку,
Бягуць, каб стаць дарогаю лясной.

Нібыта ў ветразь,
у маю спіну
За дзень замораныя дзьмуць вятры.
Тут дзесьці блізка шум ракі заснуў,
Каля якога раскладаў кастры.

Мне зараз не хапае іх цяпла
І шуму задуменнае ракі.
Вядзі мяне,
дарога,
да сяла —
Сагрэюць добрым словам землякі.

## ДЗІКІ АГРЭСТ

Пікі вострыя ў агрэста
Дзеля самаабароны?
Каркаюць загучна нешта
Здрады чорныя вароны.
Совы страху глуш вартуюць.
Ад мяне ў дупло ўцякаюць.
Сцежку грэю я лясную,
Да бяссонца прывыкаю.
Ці агрэст мяне прызнае?
Дабрыню сустрэў у пікі.

Дабрыні мо не хапае?
Ён для ласкі вельмі дзікі.
Ад сарок вакол пярэста,
І стаю я нездзіўлёны:
Пікі вострыя ў агрэста
Дзеля самаабароны.

*9.02.1981*

* * *

Гарацъ апалыя лісты,
І дым галіны дрэў бінтуе.
Па садзе холад малады
З вятрыскам весела вандруе.
Сцяжына дрэмле ля агню —
За лета шмат папрацавала.
Цяпло ўцякае ў вышыню —
Сяброў у садзе
вельмі мала…
Дымяць апалыя лісты,
І над зямлёй гусцеюць хмары.
Вітаю холад малады,
А час слязой
бяжыць па твары.

*3.03.1981*

* * *

Праз цябе, я знаю, праз цябе
Гэтак светла сёння на двары.
Вогнішча рабінніку дзяўбе
Снегірок — вясёлы сын зары.
Любая, усмешкі не хавай.
Валасы не запляці ў касу.
Хай вачэй світае сінява.
Я сняжынкі, як букет, нясу.
Не данёс. Букет расцвіў слязой.
На слязу увагі не звярні.
Паглядзі, над белаю зямлёй
Белы дзень на сонечным кані.

Ты ўсміхнулася, і мне святлей.
Снегірок, як меншы сын зары,
Падлятае да цябе бліжэй.
І яму ты ўсмешку падары.

*3.12.1980*

* * *

Дамоў, дамоў — ляскоча электрычка.
Дамоў, дамоў — грукоча гулка гром.
І я гляджу: па шыбах кропель znічкі
Малююць сцежкі, што вядуць у дом.

Дамоў, дамоў — да песні салаўінай.
Дамоў, дамоў — да песні жаўрукоў,
Пакуль прыходзіць сустракаць сцяжына,
Уплецена ў хвалі каласоў.

*14.05.1980*

* * *

Мінулым летам абмялела рэчка,
А гэтаю вясною знікла рыба.
Гавораць, гэта ад таго, што часта
Шаферы ў рэчцы сталі мыць машыны…
Цяпер да рэчкі з вёскі ўжо не ходзяць,
Вось толькі адзінокая бабуля,
Што ля ракі жыве ў сівенькай хаце,
Хоць зрэдку —
мые ў ёй бялізну, бульбу.
Усе здзіўляюца, як гэта рэчка
Да сённяшняга дня не перасохла.
Я думаю, таму, што ля ракі
Жыве яшчэ сівенькая бабуля.

*28.07.1980*

* * *

*Хведару Чэрню*

Радзімая ваколіца,
Зялёная гара.
А сонца торбай коціцца,
Паўнюткаю дабра.
І нам у шчасце верыцца,

Як верыць нам сяло.
Сарока побач верціцца:
— Вам падзялю дабро.
Вачамі вокан квецяцца
У вішняках дамы:
— Святло у нас не дзеліцца,
Валожынскія мы!

*12–13.05.1982*

* * *

Зайшла усмешка у купэ,
Пакінула мне шклянку чаю.
А я сягоння ад цябе
На самы край зямлі ўцякаю.
Танцуе лыжачка, звініць.
Праз фортку без білета вецер
Залазіць, просіць: «Не гані…»
Загрукаў мой цягнік увечар.
Ізноўку чую: «Ад'язджай…»
І колы ляскаюць: «Нялюбы…»
Я моўчкі п'ю халодны чай,
Балюча апякаю губы.

*28.09.1982*

* * *

Ёсць на Валожыншчыне вёска Пугачы,
Дзе рэчышчы сцяжын на зараслі ў лугах,
У агародчыках красуюць касачы,
Буслы
на захад
сонца коцяць па дубах.

У сэрцах ёсць таксама вёска Пугачы,
Таму сцяжыны не губляюцца ў лугах,
У агародчыках красуюць касачы,
Буслы
на захад
сонца коцяць па дубах.

*29.04.1980*

# ПОШУК РАДАСЦІ
# (1987)

* * *

А талент ад душы,
Не ад святога духу.
А без душы паэт,
Нібы рака без руху.

Век пражывеш, як дзень,
А дзень, як век, бясконцы.
Не ўсё, што хваляць — цуд,
Не ўсё, што свеціць — сонца.

Вякі перажыве
І зойдзе ў кожну хату
Не той, хто скажа шмат,
А той, хто скажа праўду.

## ФРАНЦІШАК БАГУШЭВІЧ

Ён сядзеў каля дарогі,
Як туман, увесь сівы.
— Бурачок, ты ж пахаваны.
— Дудка грае — я жывы.

— Падкажы мне, што іграці?
— Грай, што маеш на душы,
Толькі ад няшчырай песні
Дудку, браце, беражы.

І пайшоў ён па дарозе,
Як туман, увесь сівы.
— Бурачок жа пахаваны.
— Дудка грае — ён жывы.

* * *

Хата анямелая, сівая,
З шэраю буслянкай, бы вянком,
Вокнамі задумна пазірае,
Склаўшы рукі на дзвярах замком.

*1980*

* * *

Ад ветру у фортцы разбілася шыба,
Пад столь занавеска сцюдзёна трапеча.
У неба ўрастае галінамі ліпа,
У травы ўрастае туманамі вечар.

Як белыя птушкі, ўзляцелі паперы,
І стол апусцеў, нібы бераг ад стрэлу.
Са злосцю на шум зачыніліся дзверы,
І стала падлога па-снежнаму белай.

Я фортку зашкліў — яшчэ холадна ў леце,
Па месцах расклаў і паперы, і рэчы.
На самым світанні заціх буйны вецер,
Ды ліпа шуміць, занавеска трапеча.

* * *

Гайнёю быстраю ляціць
За мной мяцеліца сівая.
Пакуль дамоў ваду нясу,
Вада у вёдрах замярзае.

А снег глыбокі, і — зіма.
Стаяць аціхлыя рабіны —
У іх, на ўзгорку за сялом,
Прымерзлі да нябёс галіны.

Рыпяць, спяваюць пада мной
У сенцах выстылых масніцы.
Ваду стаўляю,
а вядро
Не адпускае рукавіцу.

*9.11.1983*



**Віктар Анатольевіч Шніп**

Нарадзіўся 26 сакавіка 1960 года ў вёсцы Пугачы Валожынскага раёна.

Закончыў Мінскі архітэктурна-будаўнічы тэхнікум і Вышэйшыя літаратурныя курсы Літаратурнага інстытута імя М. Горкага ў Маскве ў 1987 г. Пасля працаваў у часопісе «Беларусь», газеце «Наша слова». З 1995 па 2004 г. — у газеце «Літаратура і мастацтва» быў намеснікам галоўнага рэдактара і галоўным рэдактарам. Цяпер — галоўны рэдактара выдавецтва «Мастацкая літаратура».

Першыя вершы былі надрукаваны 17 жніўня 1977 г. у газеце «Чырвоная змена». У 1983 г. выйшла першая кніга вершаў «Гронка святла», за якую ў 1987 г. атрымаў Усесаюзную прэмію імя Уладзіміра Маякоўскага.

Выдаў 15 кніг, сярод якіх: «Пошук радасці», «Шляхам ветру», «На рэштках Храма», «Горад Утопія», «Выкраданне Еўропы», «Чырвоны ліхтар», «Воўчы вецер», «Інквізіцыя», «Выратаванне атрутай» , «Беларускае мора» і інш.

У 2007 г. за кнігу «Балада камянёў» стаў лаўрэатам літаратурнай прэміі «Залаты Купідон». За кнігу «Страла кахання, любові крыж» атрымаў спецыяльную прэмію Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у намінацыі «Мастацкая літаратура» (2008).

Выдатнік друку Рэспублікі Беларусь.

# ЗМЕСТ

## ГРОНКА СВЯТЛА (1983)

* * * Першага снегу святло... 3
* * * Пакрыўдзяць, а я не заплачу... 3
Мірскі замакі 4
* * * Холад ля хаты пасе снегіроў... 4
Плача маці 5
Лясной дарогай 5
Дзікі агрэст 5
* * * Гараць апалыя лісты... 6
* * * Праз цябе, я знаю, праз цябе... 6
* * * Дамоў, дамоў — ляскоча электрычка... 7
* * * Мінулым летам абмялела рэчка... 7
* * * Радзімая ваколіца... 7
* * * Зайшла усмешка у купэ... 8
* * * Ёсць на Валожыншчыне вёска Пугачы... 8

## ПОШУК РАДАСЦІ (1987)

* * * А талент ад душы... 9
Францішак Багушэвіч 9
* * * Хата анямелая, сівая... 10
* * * Ад ветру у фортцы разбілася шыба... 10
* * * Гайнёю быстраю ляціць... 10
Невядомай дзяўчыне 11
* * * І прыйдзе час, і ўсё забудзеш... 11
* * * Ападае лісцё, ападае... 11
* * * Белы воран над полем ляцеў... 12
Скрыпка 12
Балада пра каваля 13
Гліняная птушка 13
* * * На зарослай кустамі гары... 13
Паэзія 14

## ШЛЯХАМ ВЕТРУ (1990)

Беларусь стаіць на курганах 15
Балада Паўлюка Багрыма 16

Балада пра беларуса на чужыне . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .16
Год смерці — 1937 . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .17
Балада пра сляпога, які ўсё бачыў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .18
Вуліца Садовая . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .18
Камень . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .19
У птушыным царстве . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .19
За нябачнай сцяной . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .20
Воўк . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .20
* * * Калгаснага каня скрадзе цыган… . . . . . . . . . . . . . . . . .21
* * * Па чорнай дарозе праз чорную ноч… . . . . . . . . . . . . . .22
* * * Нібыта збавенне ад болю… . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .22
* * * Чаму маўчаў, калі глумілі мову… . . . . . . . . . . . . . . . . .23
* * * Адмаўляю сябе былога… . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .23
* * * Калі анёл над намі пралятаў… . . . . . . . . . . . . . . . . . . .24
Прарок . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .24
* * * Шэры шэрага вядзе… . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .25
* * * У кавярні пахне кавай… . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .26
Палоннікі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .26
Памяць . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .27
* * * Яшчэ горад не спіць, завываюць машыны… . . . . .27
Дрэвы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .28
Непрызнаны мастак . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .28
* * * Сябры мне часта гаварылі… . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .29
* * * Люблю вакзала тлумны Вавілон… . . . . . . . . . . . . . . .29
Дарога да маці . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .30
* * * Невядома адкуль прылятае блакітная птаха… . . .31
Гара . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .32
* * * Апусціліся нізка густыя аблокі… . . . . . . . . . . . . . . . . .32
Навагодняя казка для Людмілы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .33
* * * Мы з табою ішлі па дарозе… . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .34
* * * Светла і холадна ў свеце… . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .34
* * * І ноч рассыплецца на росы… . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .35
* * * Я сяджу ля кастра і гляджу праз агонь
на дарогу… . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .35
* * * За акном, як у бездані, ходзіць туман… . . . . . . . . . . .36
Вечар . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .37
* * * Мне век ісці ў высокую зару… . . . . . . . . . . . . . . . . . . .37

## ГОРАД УТОПІЯ (1990)

У буфеце аўтастанцыі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .38
У час зялёнага дажджу . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .38
У Цэнтральным доме літаратара . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .39
Казка пра залаты злітак . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .39

* * * Ізноў самота незямная… . . . . . . . . . . . . . . . . 40
Апакаліпсіс . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 41

## НА РЭШТКАХ ХРАМА (1994)

Балада пра нешляхетнага пана . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 42
Балада карліка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 43
Спальванне ведзьмака . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 44
Балада здрадніка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 45
Горад N, 20-я гады . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 45
Балада Язэпа Драздовіча . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 46
Балада апошняга рыцара, які трапіў
у Чарнобыльскую зону . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 47
Валуны . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 48
* * * За чорным полем белы Замак… . . . . . . . . . . . . . . 48
Казка пра цмока . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 49
* * * У ката закахалася паненка… . . . . . . . . . . . . . . . . . 50
* * * стаю пад вокнамі радзільнага дома… . . . . . . . . . 51
Два вершы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 52
Наша восень . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 53
Манекеншчыца . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 54
Сабака . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 55
Чалавек-рыба . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 55
* * * Няма Караткевічаў новых… . . . . . . . . . . . . . . . . . . 56
* * * Паэта губіць геніяльнасць адзіноты… . . . . . . . . . 56
Помста . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 57
Залатая карона змяі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 58
* * * У стагоддзях сну і чорных кратаў… . . . . . . . . . . . . 58
Балада . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 59
* * * Начнога вакзала гнілое паветра… . . . . . . . . . . . . . 60
* * * Не люструецца неба ў змутнелай вадзе… . . . . . . . 60
* * * Зноў агонь дагарае, цямнее ваколле… . . . . . . . . . . 61
* * * Агеньчык свечкі ў цемнаце трапеча… . . . . . . . . . 61
Вогнішча ля Храма . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 62
Балада разбойніка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 62
* * * Разбураны замак. Высокія травы… . . . . . . . . . . . . 63
* * * Па дарозе бясконцай, як вечнасць зямная… . . . . . 64
* * * Не сумуй, што ўжо вясна мінула… . . . . . . . . . . . . . 64
* * * Ад мітусні жыццёвае стамлёны… . . . . . . . . . . . . . 65

## ВЫКРАДАННЕ ЕЎРОПЫ (1996)

Пыл . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 66
Ружа . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 68
Здрада . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 68

Палонка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 69
Каса . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 70
Лёд . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 70
Ноч . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 71
Выкраданне агню . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 71
Выкраданне залатога руна . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 72
* * * Вы зноў намалюеце ружы… . . . . . . . . . . . . . . . . . 73
* * * Стаміўшыся ад дзённай мітусні… . . . . . . . . . . . 73
* * * Плыве паціху ў небыццё… . . . . . . . . . . . . . . . . . 74

## ВОЎЧЫ ВЕЦЕР (2001)

* * * Ты ўцякаеш… Куды? Сам не знаеш… . . . . . . . . . . 75
* * * А мне восень ты намалявала… . . . . . . . . . . . . . . 75
* * * Зноўку змрочна, дажджліва,
сцюдзёна і шэра… . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 76
Мне снілася Вільня . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 76
* * * Гэты дождж, як пачатак патопу… . . . . . . . . . . . . 77
Балада Дуніна-Марцінкевіча . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 77
На станцыі «Няміга» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 78
* * * Зноўку снегам засыпаны нашы дамы… . . . . . . . . 79
* * * Іосіфа Бродскага томік чытаю… . . . . . . . . . . . . 79
* * * Гэты дзень, як твая адзінота… . . . . . . . . . . . . . . 79
* * * За вакном Еўропа і зіма... . . . . . . . . . . . . . . . . . 80
* * * Нічога ў свеце вечнага няма… . . . . . . . . . . . . . . 80
* * * Я не прывыкну да дажджоў ніколі… . . . . . . . . . . 81
* * * Нашым дыханнем напоўнена неба… . . . . . . . . . . 81
* * * Ты сумны, як снег сакавіцкі на ўзгорку… . . . . . . . 82
* * * У гэтым свеце мы жывём… . . . . . . . . . . . . . . . . 82
* * * Мы пражылі дваццатае стагоддзе… . . . . . . . . . . . 83

## ІНКВІЗІЦЫЯ (2002)

У святы вечар . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 84
Балада Ноя . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 84
* * * Не хочацца думаць, што мы ўсе памром… . . . . . . 85
Сячкарня . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 85
У Доме творчасці . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 86
* * * У гэтым дні хачу я затрымацца… . . . . . . . . . . . . 86
* * * Вось і сонца за сосны зайшло… . . . . . . . . . . . . . 87
* * * Па Кальварыйскіх могілках хаджу… . . . . . . . . . . . 87
Балада апошняга князя . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 88
Балада Айчыны . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 89
Выкраданне каханай . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 89
* * * Зноў мой сум, як туман над маёю дарогай… . . . . 90

* * * Самотных вершаў не пісаць… . . . . . . . . . . . . . . 90
Казка пра ваўка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 90
Апошні дзень . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 91
* * * Вялікая, самотная Расія… . . . . . . . . . . . . . . . . 91
* * * Ты ведаеш даўно, што мы памром… . . . . . . . . 92
* * * Начныя вуліцы залітыя святлом… . . . . . . . . . 93
* * * Калі зноў пачынаюцца дажджы… . . . . . . . . . . 93
* * * ...У зіме адзінокія мы… . . . . . . . . . . . . . . . . . . 94
* * * Ад нас застануцца не нашы пасады… . . . . . . . . . 94
Лета прайшло… . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 95
* * * ...І трэснула неба, як шкло на іконе… . . . . . . . 95
* * * Нам заўтра дадому вяртацца… . . . . . . . . . . . . 96
* * * Святло патухла, бы спыніўся час… . . . . . . . . . 96

## ВЫРАТАВАННЕ АТРУТАЙ (2003)

Балада Нямігі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 97
Балада вераснёвай начы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 97
Балада жыцця і смерці . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 98
Балада Максіма Лужаніна . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 98
Балада Паўліны Мядзёлкі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 99
* * * Ссівелая трава зімы чакае… . . . . . . . . . . . . . . 100
* * * Вецер халодны, нібыта сабака галодны… . . . . . . 100
* * * ...А шэры горад змыецца вадой… . . . . . . . . . . . 101
* * * Вярнуўся ў Лягезы, нібыта прачнуўся… . . . . . . . 101
* * * Аб сцяну залатую бяроз… . . . . . . . . . . . . . . . . 102
* * * Рана ці позна зіма праміне… . . . . . . . . . . . . . 102

## БЕЛАРУСКАЕ МОРА (2004)

Беларускае мора . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 104
Полацкая балада . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 104
Балада Мірскага замка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 105
Балада Крэўскага замка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 106
Балада Уладзіміра Караткевіча . . . . . . . . . . . . . . . . 106
Балада Мксіма Танка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 107
Балада Васіля Быкава . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 108
Балада пра царкву і ваўка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 108
Балада замка ў Лоску . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 109
Балада першага снегу . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 110
Балада XX стагоддзя . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 110
Балада дваіх . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 111
Балада ўцёкаў з карчмы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 111
Балада развітання . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 112
Балада вяртання . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 113

Балада замерзлай рэчкі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 113
Пірацкая балада . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 114
Балада Яўгеніі Янішчыц . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 114
Балада Васіля Сахарчука . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 115
* * * Мы яшчэ маладыя з табой… . . . . . . . . . . . . . . 116
Спёка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 116
* * * Зноў за вокнамі ноч, як бяздонне… . . . . . . . . 117
* * * Пад тваімі вокнамі рабіна… . . . . . . . . . . . . . . 117
* * * Мы затоплены часам, нібыта вадой… . . . . . . . 118
* * * Песні слухаю, і піва п’ю… . . . . . . . . . . . . . . . 118
* * * Згарыць папера, попел застанецца… . . . . . . . 119
* * * Я ізноўку адзін, як нявольнік… . . . . . . . . . . . 119
* * * Праз ноч, як праз далеч, імчыцца цягнік… . . . . 120
* * * Хутка снегам сады замятуцца… . . . . . . . . . . . 120
* * * ...Дрэвы ператворацца ў вялікіх птушак… . . . . . 121
* * * Ты далёка, як тое, што будзе праз год… . . . . . 121
* * * Неба над намі нібыта вада... . . . . . . . . . . . . . 121
Гісторыя аднаго кахання . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 122
* * * Сябе прапіў, нібы сябе забіў… . . . . . . . . . . . 127
* * * Не хадзі ты ў карчму, не глядзі ты ў акно… . . . 127
* * * ...А сёння канчаецца нашае лета… . . . . . . . . . 128
У вечным горадзе . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 128
Чорная постаць . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 129
* * * Ад’язджаем, быццам паміраем… . . . . . . . . . . 129
* * * Чырвоную гліну — застылую кроў… . . . . . . . . 130
Казка пра кавярню смерці . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 130
* * * Яшчэ будуць высокія мяккія травы… . . . . . . . 131
* * * Зноў без вас не знаходжу спакою… . . . . . . . . 131
* * * Восень. Самотная восень Айчыны… . . . . . . . . 132
Сад адвечнай самоты . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 133
* * * Вячэрняю смугой затоплены прасторы… . . . . 133
* * * Спачатку музыка была… . . . . . . . . . . . . . . . . 133
* * * Каркаюць абрыдліва вароны… . . . . . . . . . . . 134
* * * На шэрым снезе чорныя гракі… . . . . . . . . . . . 134
* * * Вецер згінае высокія дрэвы… . . . . . . . . . . . . 135
Студня . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 135
Яблык . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 136
Човен . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 137
Гаршчок . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 138
Плот . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 138
Падкова . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 139
Сон . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 140
Свечка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 141

**БАЛАДА КАМЯНЁЎ (2006)**

Балада Міндоўга . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 142
Балада Гедзіміна . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 143
Балада Альгерда . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 143
Балада Вітаўта Вялікага . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 144
Балада Ягайлы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 144
Балада Грунвальдскай бітвы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 145
Балада Боны Сфорцы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 146
Балада Барбары Радзівіл . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 146
Балада Сымона Буднага . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 147
Балада Льва Сапегі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 148
Балада Міхала Клеафаса Агінскага . . . . . . . . . . . . . . . . 149
Балада Турава . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 149
Балада Белай Вежы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 150
Балада Янкі Купалы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 151
Балада Уладзіміра Дубоўкі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 151
Балада Паўлюка Труса . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 152
Балада Івана Шамякіна . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 153
Балада патопу . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 154
Балада пылу над дарогай . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 154
Балада дажджлівых дзён . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 155
Балада ўсходу сонца . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 155
Балада восеньскага туману . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 155
Дарога да Храма
- Храм . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 156
- Камяні . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 159
- Лес . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 162
- Жанчыны . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 164
- Каханне . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 167
- Тэатр . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 170
- Снег . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 174
- Кнігарня . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 177
- Агонь . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 180
- Грошы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 183
- Школа . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 186
- Вада . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 188
- Поле . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 191
- Вакзал . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 194
- Бальніца . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 197
- Бібліятэка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 200
- Сцяжыны . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 202
- Дарога... . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 204

* * * У малой, але сваёй краіне… . . . . . . . . . . . . . . . 207

* * * Я нікому не здрадзіў,
тым болей — Радзіме… . . . . . . . . . . . . . . . . 207
* * * Прыходзяць вершы, як забойцы, ноччу… . . . . . 208
* * * Гэта наша з табою зямля! Гэта наша… . . . . . . . . 208
Згубіцца . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 209
* * * Напоўнена неба чырвонай вадой… . . . . . . . . . . 209
* * * Воўк крыві, як мы віна, нап'ецца… . . . . . . . . . . 210
* * * Ты заходзіш у Храм, як у неба ўзлятаеш… . . . . . 210
* * * Я не прывыкну да дажджоў ніколі… . . . . . . . . . . 211
* * * Дымотна канчаецца тлумнае лета… . . . . . . . . . . 211
* * * Нам у грахах, нібы ў снягах, губляцца… . . . . . . . 211
* * * Люблю, нібы агонь, балоты… . . . . . . . . . . . . . . . 212
* * * У дні, нібыта ў залатым агні… . . . . . . . . . . . . . 212
* * * Праляцелі дні, як павуціна… . . . . . . . . . . . . . . . 213
* * * …І неба, нібы лёд, растала… . . . . . . . . . . . . . . 213
* * * …Дажыць нам трэба да канца зімы… . . . . . . . . . 214
* * * Сёння вецер у Храм заляцеў… . . . . . . . . . . . . . . 214
* * * Прасцей за ўсё крычаць:
«Люблю наш край!»… . . . . . . . . . . . . . . . . . . 215
* * * Сасновы лес. Туман, нібыта дым… . . . . . . . . . . 215
* * * Сталі сумнымі дні, бы ў калюгах вада… . . . . . . . 216
* * * Вечарэе, і ружа жывая… . . . . . . . . . . . . . . . . . . 216
* * * Травінкай кволаю сярод травы… . . . . . . . . . . . . 217
* * * …І ўсё ж сябры прыходзяць і сыходзяць… . . . . 217
* * * Найлепшая ў свеце краіна… . . . . . . . . . . . . . . . . 217
* * * Белае золата снегу ўначы… . . . . . . . . . . . . . . . 218

**СТРАЛА КАХАННЯ, ЛЮБОВІ КРЫЖ (2008)**

Балада Германа Шніпа . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 219
Балада Язэпа Шніпа . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 220
Балада Кандрата Шніпа . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 220
Балада Яські Шніпа . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 221
Балада Язэпа Шніпа . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 221
Балада Анатоля Шніпа . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 222
Яблыкі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 222
Бульба . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 225
Сала . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 233
Рыба . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 235
Хлеб . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 237
Балада Эдварда Вайніловіча . . . . . . . . . . . . . . . . . . 238
Балада Кузьмы Чорнага . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 239
Балада Якуба Коласа . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 239
Балада Канстанцыі Буйло . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 240

Балада Уладзіслава Галубка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 241
Балада неба . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 241
Балада Тутэйшага . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 242
Балада блуднага сына . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 242
* * * Дажджы мне ў душу намываюць самоту… . . . . . 243
* * * У кожным божым дні, нібы ў агні… . . . . . . . . . . . 244
Элегія снегу . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 244
* * * У гэтым свеце мне не быць з табою… . . . . . . . . . . 245
* * * Мы сабе прыдумляем праблемы… . . . . . . . . . . . . . 245
* * * Кожны можа пакрыўдзіць паэта… . . . . . . . . . . . . . 245
* * * На вуліцы цемра,
як соннае ў пляшцы віно… . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 246
Я хадзіў... . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 246
* * * Там, дзе вецер над полем,
як выгнаны з раю… . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 247
* * * Тут няспешна жыццё працякае… . . . . . . . . . . . . . . 247
* * * Сонца хаваецца за небакраем… . . . . . . . . . . . . . . . 248
Белая царква . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 248
Па дарозе да Храма . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 249
* * * Пра што мае вершы? Пра тое, як мы… . . . . . . . . 254